*Барвенава Ганна Аляксандраўна,*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,
дацэнт кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры,
кандыдат мастацтвазнаўства

# Асноўныя крыніцы вывучэння тэкстылю, касцюма і іншых паказчыкаў матэрыяльнай культуры эпохі Сярэднявечча

*Асноўнымі крыніцамі вывучэння матэрыяльнай культуры з 'яўляюцца археалагічныя матэрыялы (тканіны, прылады працы і інш.), пісьмовыя помнікі (летапісы, дробная пластыка з выявай чалавека ў касцюме). Разнастайныя звесткі, дапаўняючы адна адну, узнаўляюць карціну развіцця мясцовай тэкстыльнай вытворчасці ў часы Сярэднявечча і насычэння рынку старабеларускіх княстваў-дзяржаў і рынкаў ВКЛ імпартуемым тэкстыльным таварам.*

Гісторыя тэкстылю, касцюма, мэблі і іншых паказчыкаў развіцця матэрыяльнай культуры эпохі Сярэднявечча на землях Беларусі ў навуковай літаратуры асветлена недастаткова. У той час як многія заходнееўрапейскія краіны стварылі энцыклапедыі развіцця матэрыяльнай культуры ў канцы XIX — пачатку XX ст., беларускія даследчыкі закранулі толькі некаторыя пытанні. У дадзеным артыкуле прапануецца аналіз асноўных крыніц вывучэння тэкстылю і касцюма як сімвалічных візуальных паказчыкаў развіцця старажытнабеларускага грамадства.

Ступень вывучанасці сярэднявечнага тэкстылю (тэкстыльныя вырабы, гафтаванне, прылады працы, тэхналогія вытворчасці) і касцюма (адзенне, галаўны ўбор, абутак) розная. Да другой паловы XX ст. для вывучэння старажытнабеларускага (старажытнарускага) касцюма асноўнай крыніцай былі пераважна фрэскі, мініяцюры і помнікі літаратуры (А. Арцыхоўскі, І. Сразнеўскі і інш.). Да нядаўняга часу для стварэння цэласнай карціны развіцця тэкстылю Сярэднявечча беларускія даследчыкі звярталіся толькі да археалагічнага матэрыялу. Даследаванні беларускіх гісторыкаў Л Дучыд, А. Кваткоўскай, Ю. Бохана і іншых, прысвечаныя касцюму, грунтуюцца на аснове глыбокага аналізу археалагічнага матэрыялу з мінімальным прыцягненнем візуальных і пісьмовых крыніц [2; 3]. Такі падыход абумовіў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фрагментарнасць вывучанасці тэмы. Пытанне ўзаемаўплыву тэкстылю і касцюма не падымалася ўвогуле.

Вывучэнне матэрыяльнай культуры Сярэднявечча на землях Беларусі павінна базіравацца на шырокім коле крыніц. Аснову даследавання складаюць тэкстыльныя творы (тканіны, вышыўка, адзенне) або іншыя захаваныя творы мастацтва, археалагічны матэрыял (тканіны, тэкстыльная аздоба, прылады працы, астэалагічны матэрыял), творы выяўленчага і дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва (манументальны жывапіс, мініяцюры рукапісаў, абразы, дробная пластыка), пісьмовыя, нумізматычныя матэрыялы X-XVI стст.

Найбольш знакавыя тканіны музейных збораў Беларусі і іншых краін Еўропы надрукаваны ў каталогах, што дазваляе правесці параўнаўчы аналіз, удакладніць даціроўку і этымалогію тканіны, шляхі запазычання арнаментальных схем. Каталогаў, прысвечаных тэкстылю Сярэднявечча на землях Беларусі, пакуль няма. Асобныя тканіны, якія з'яўляюцца экспанатамі мастацкіх, гістарычных, краязнаўчых і іншых музеяў, пададзены сярод іншых твораў мастацтва ў тэматычных і музейных каталогах. Н. Ф. Высоцкая ўпершыню аналіз тэкстыльнага мастацтва Беларусі (тканін, вышыўкі, карунак, шпалер), як і іншых відаў мастацтва, пачала з часоў Сярэднявечча, доказваючы заканамернасць эвалюцыі стылістыкі. Каталогі Музея старажытнабеларускай культуры, Дзяржаўнага музея БССР і інш., нягледзячы на багатыя тэкстыльныя калекцыі, што часткова экспануюцца ў сталых экспазіцыях, на жаль, не звяртаюцца да твораў тэкстыльнага мастацтва, касцюма. Сярод тэкстыльных твораў розных перыядаў гісторыі мастацтва найбольш поўна каталагізаваны і апісаны слуцкія паясы і іх фрагменты, якія захоўваюцца ў музеях Беларусі, Польшчы, Расіі, шматлікіх калекцыях свету. Распрацаваная метадалогія даследавання можа быць выкарыстана пры аналізе тэкстыльных твораў іншых эпох.

Каталагізацыя багацейшых тэкстыльных калекцый Расіі, у тым ліку тканін часоў Кіеўскай Русі, пачалася з пачатку XX ст. Даследчыкі аналізавалі і падавалі ў каталогах тэкстыльныя творы ад высокамастацкай вышыўкі золатам і срэбрам да пабытавага старажытнарускага ткацтва X-XVI стст. Варта адзначыць, што некаторыя творы тэкстылю з тэрыторыі Беларусі (ВКЛ), што захоўваюцца ў еўрапейскіх і расійскіх музейных зборах, пакуль беларускім мастацтвазнаўцам малавядомыя, іншыя ўведзены ў мастацтвазнаўчы арсенал як рускія,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праўда, з указаннем на еўрапейскасць паходжання ці стылістыкі або «няраскае выкананне» [4, с. 9, 21; 5, с. 34-36].

Не так пазітыўна выглядае справа з археалагічным тэкстыльным матэрыялам. У выніку археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў адкрытых храмавых і курганных пахаваннях, у культурных пластах гарадоў былі знойдзены разнастайныя рэшткі адзення, галаўных убораў, паясоў, упрыгожанняў, абутку, ткацкіх прылад працы, астэалагічны матэрыял. Узоры шаўковых, ільняных і ваўняных тканін, выяўленых на тэрыторыі Беларусі, захоўваюцца ў музейных калекцыях Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіны [7]. З цягам часу выяўленыя археолагамі тканіны разбураюцца, дэфармуюцца, блякне іх колер, таму тэкстыльныя археалагічныя знаходкі патрабуюць прафесійнай спецыялізаванай апрацоўкі, падчас якой аналізуецца тэкстура тканіны, яе арнаментыка і пляценне, даследуюцца склад нітак і фарбавальнікі. Пасля гэтага фрагмент рэстаўруецца і кансервуецца ў рэстаўрацыйных майстэрнях для музейнага экспанавання або захавання ў музейных фондах [1; 8; 9]. На жаль, сотні фрагментаў унікальных тканін, знойдзеных на беларускіх землях, дагэтуль чакаюць сваёй апрацоўкі або ўжо беззваротна страчаны. У археалагічных справаздачах інфармацыя пра выяўленыя тэкстыльныя фрагменты носіць выключна статыстычны характар, фотаздымкі тэкстыльных фрагментаў амаль не сустракаюцца ў манаграфіях археолагаў. Археалагічны матэрыял позняга Сярэднявечча налічвае адзінкі, бо частковае ігнараванне археалагічнага матэрыялу часоў BKJ1 было звязана з ідэалагічным поглядам часоў СССР на гісторыю нашай зямлі. Гэта прывяло да страты важнейшай крыніцы даследавання гісторыі ВКЛ — археалагічнага матэрыялу.

Важнейшай крыніцай інфармацыі па развіццю тэкстыльнай вытворчасці Еўропы, імпарту і экспарту тканін у X — пачатку XVI ст., пра вырошчванне валаконных і фарбавальных раслін, авечкагадоўлю на тэрыторыі Усходняй Еўропы, вытворцаў прадукцыі, тыпалогію, каларыстыку, арнаментыку тэкстыльных вырабаў з'яўляюцца пісьмовыя крыніцы: летапісы, хронікі, помнікі агіяграфіі (апісанні жыцця святых), павучанні, лісты, заканадаўчыя акты, тастаменты, вопісы маёмасці, рахункі каралеўскага двара, спісы дароў, сведчанні іншаземных аўтараў і інш. Сінтэтычныя па жанру летапісы разам з гістарычным паданнем матэрыялу (нярэдка пагадавы прынцып

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падачы звестак) уключалі пералік багаццяў храма (напр., *телены саженыа жемчюгом с златом и каменьем»),* пералік дароў каралю, князю, людзям духоўным (напр., «*Учти князя великого Витовта многими дарами: чепьми золотыми, и поясы золотымй, и соболми, камками»),* апісанне прадметаў гандлю і рабунку («*товар бесчислен»),* пералік гарадскіх рамеснікаў і купцоў *(«сукоиники», «кожемякі*») і іх тавару, пералік запатрабаваных жывёл і іх футра («.. .*рысей, куниц, лисиц, белок, горностаев и иных розмаитых рожаев*»), а таксама многія іншыя найважнейшыя факты для даследавання побыту Сярэднявечча [6, с. 92, 106, 96, 107], Шматбаковага вывучэння пісьмовых усходнеславянскіх крыніц з пункту гледжання аналізаў тэкстыльнай ці іншай вытворчасці XI-XVI стст. пакуль не было. Мовазнаўцамі і літаратуразнаўцамі пакуль не праведзены параўнаўчы аналіз апісання побыту (у тым ліку тэкстылю) на аснове твораў усходнеславянскай і перакладной сярэднявечнай літаратуры.

Творы сярэднявечнага выяўленчага і дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва Сярэднявечча (на якіх адлюстраваны чалавек у касцюме) нешматлікія, таму большасць з іх экспануюцца ў сталых экспазіцыях беларускіх музеяў, пададзены ў каталогах, энцыклапедыях, манаграфіях і даследаваннях вядучых беларускіх мастацтвазнаўцаў: В. В. Церашчатавай, А. А. Сяліцкага, А. К. Лявонавай, В. Ф. Шматава і мн. інш.

Такім чынам, аналіз матэрыяльнай культуры (у нашым выпадку тэкстылю і касцюма) старажытнабеларускіх княстваў і тэкстылю ВКЛ грунтуецца на аснове ўсіх даступных крыніц — захаваных твораў ткацтва і гафту, археалагічных знаходак, пісьмовых помнікаў, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, рэалій пазнейшага часу. Разрозненыя шматгаліновыя звесткі ўзаемадапаўняюць адна адну, дапамагаюць стварыць цэласную карціну развіцця мясцовай тэкстыльнай вытворчасці ў часы Сярэднявечча і насычэння рынку старабеларускіх княстваў-дзяржаў, рынкаў Вялікага Княства Літоўскага імпартаваным тэкстыльным таварам.

*Літаратура*

1. *Гаврилюк, Б. К.* Культура клеток и реконструкция ткани (на примере кожи) / Б. К. Гаврилюк, Ю. А. Рочев, Т. Н. Николаева / АН СССР, Науч. центр биол. исслед., Ин-т биол. физики. — Пущино : ОНТИ НЦБИ АН СССР, 1988. — 121 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Дучыц, Л. У.* Касцюм жыхароў Беларусі X-XIII стст. (паводле археалагічных звестак) / Л. У. Дучыц. — Мінск : Навука і тэхніка, 1995. — 80 с.

3. *Квяткоўская, А. В.* Вясковы жаночы касцюм XI-XVIII стст. (па матэрыялах каменных могільнікаў Беларусі. Спроба рэканструкцыі) / А. В. Квяткоўская, Ю. М. Бохан // Гістарычна-археалагічны зборнік. — 1994, —№4, —С. 114-133.

4. *Маясова, Н. А.* Древнерусское шитье : альбом / Н. А. Маясова. — М. : Искусство, 1971. — 91 с.

5. *Свирин, А. Н.* Древнерусское шитье / А. Н. Свирин. — М. : Искусство, 1963. — 152 с.

6. Старажытная беларуская літаратура / уклад. Л. С. Курбека. — Мінск : Юнацтва, 1990. — 350 с.

7. *Фехнер, М. В.* Древнерусское золотное шитье X—XIII вв. в собрании Государственного исторического музея / М. В. Фехнер // Средневековые древности Восточной Европы : сб. ст. / Гос. ист. музей ; отв. ред. Н. Г. Недошивина. — 1993. — Вып. 82. — С. 3-21.

8. *Biesaga, M.* Zastosowanie chromatografii cieczowej w badaniach barwnikow tkanin zabytkowych / M. Biesaga, M. Donten // Kwartalnik historii kultury materialnej. — Warszawa, 2004. — № 3. — S. 331-339.

9. Konserwacja tkanin zabytkowych. Grupa Robocza Krajow Socjalistycznych d/s konserwacji zabytkow historii, kultury i muzealiow. — Warszawa : Warexpo, 1988. — 48 s.

***Summary***

*The main sources of studying of material culture are archaeological materials (fabrics, tools etc.), written monuments (chronicles, contracts etc.), visual sources (murals, reliefs and other products of arts). Various data, supplementing with each other, recreate a picture of development of local textile manufacture at the time of the Middle Ages, and saturation of the market of Belorussian princedoms-states and markets Great Kingdom of Lithuania with the imported textile goods.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ